

АДЛІК НА СЕКУНДЫ 4

РЫХТУЕМСЯ ДА ЦЯЖАРНАСЦІ 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 КРАСАВІКА 2020 г. СЕРАДА № 82 (29196)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, першы віцэ-прэм'ер:**

*«Ідзе штотыднёвая работа, каб пастарацца прыцягнуць рэсурсы, разгрузіць бюджэт, падтрымаць устойлівасць нашага дзяржаўнага доўгу і магчымасць яго рэфінансавання ў тых аб'ёмах, якія мы планавалі на пачатку гэтага года. Калі казаць пра перагаворы з МВФ, то ў рамках нашай квоты гэта прыкладна 900 мільёнаў долараў. Сусветны банк — гэта перагаворы прыкладна на 300 мільёнаў долараў, Еўрапейскі інвестыцыйны банк — таксама прыкладна 300 мільёнаў долараў. Сумарна каля 2-2,5 мільярда долараў мы зможам прыцягнуць ад знешніх крэдытораў. Гэта будзе вельмі добрая лічба».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба вярнуць гэты кавалак беларускай зямлі да жыцця»



Фота БелТА.

### На тэрыторыях, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, мяркуецца ствараць буйныя вытворчыя холдынгі пры ўмове атрымання «чыстай» прадукцыі

**У 34-ю гадавіну аварыі на Чарнобыльскай АЭС Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка традыцыйна наведаў тэрыторыі, якія пацярпелі ад наступстваў катастрофы. Сёлета гэта — Нараўлянскі раён, частка якога ўваходзіць у 30-кіламетровую зону адчужэння.**

Кіраўнік дзяржавы прыязджаў сюды і раней, быў на 25-ю гадавіну аварыі. Падчас той паездкі вучоныя і мясцовае кіраўніцтва прапанавалі беларускаму лідару задзейнічаць для развіцця турызму і сельскагаспадарчых работ частку выключаных з выкарыстання зямель. Размова ішла пра чатыры тысячы гектараў у Магілёўскай вобласці і 34 тысячы гектараў — у Гомельскай, на якіх, на думку вучоных, пры пэўных умовах ужо можна атрымліваць «чыстую» прадукцыю.

СТАР. 2

# ВОДАР ХАЛОДНАЙ ВЯСНЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Медыкі будуць атрымліваць з прафсаюзнага спецфонду ад Br600 да Br5 тысяч.**
- Дапамогу па беспрацоўі могуць павялічыць да памеру бюджэту пражытачнага мінімуму.
- **«Белавія» пачынае выконваць палёты ў Вену.**
- Адзіная платформа дыстанцыйнага навучання школьнікаў можа з'явіцца да канца года.
- **Белдзяржфілармонія ўвайшла ў топ-3 найлепшых сярод краін СНД.**
- Алімпіяду ў Токіа давядзецца адмяніць, калі да 2021 года не будзе пераможаны каранавірус.
- **У Беларусі часова дазволілі продаж лекаў з незарэгістраванымі цэнамі.**
- Інтэлектуальная анлайн-гульня «Дарогамі вайны» адбудзецца ў БДУ 30 красавіка. Спаборніцтва пройдзе на платформе Google. Старт будзе дадзены ў 14.30. Заяўкі на ўдзел прымаюцца да 12.30 30 красавіка.

ISSN 1990 - 763X

20082

9 771990 763008

Падрабязнасці

# Арэндныя канікулы і сацыяльная падтрымка

**У канцы мінулага тыдня Прэзідэнт падпісаў Указ 143 «Аб падтрымцы эканомікі», які быў прыняты па выніках нарады 23 красавіка аб першачарговых мерах па забеспячэнні ўстойлівай работы эканомікі і сацыяльнай сферы краіны ва ўмовах сусветнай эпідэміялагічнай сітуацыі.**

Паколькі гэты важны дакумент датычыцца многіх, сёння мы публікуем яго падрабязны пераказ.

### У сферы падаткаабкладання

Згодна з дакументам, дадзена адтэрміноўка і растэрміноўка выплаты падатковых крэдытаў, скарочаны тэрмін вяртання з бюджэту розніцы паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай ПДВ. Індывідуальным прадпрымальнікам даецца магчымасць пераходу на іншыя рэжымы падаткаабкладання і пераразліку адзінага падатку ў сувязі з часовым неажыццяўленнем імі дзейнасці.

Уводзяцца арэндныя канікулы, мараторый на павелічэнне базавай арэнднай велічыні і арэнднай платы. Акрамя таго, мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы атрымліваюць права змяншаць маёмасныя падаткі. Юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам — уласнікам маёмасці рэкамендавана даваць арандатарам адтэрміноўку па арэнднай плаце, а таксама змяншаць яе памер з улікам аб'ёму іх выручкі.

Выбраны арганізацыяй парадак падатковага ўліку курсавых розніц можа быць зменены аднаразова на працягу 2020 года і будзе дзейнічаць на працягу ўсяго падатковага перыяду.

СТАР. 3

# «Трэба вярнуць гэты кавалак беларускай зямлі да жыцця»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Пазіцыя кіраўніка дзяржавы — абавязковая навуковая абгрунтаванасць і аб'ектыўнасць у прыняцці такога рашэння. У выніку былі распрацаваны парадак вяртання ў сельскагаспадарчы абарот зямель з катэгорыі радыяцыйна-небяспечных. І штогод у сельскую гаспадарку пакрысе ўводзяцца землі, якія не апрацоўваліся каля трох апошніх дзесяцігоддзяў.

Падчас сёлетняга візіту Прэзідэнт заявіў: надышоў час актыўна асвойваць гэты край. Але рабочыя паездкі кіраўніка дзяржавы ніколі не абмяжоўваюцца адной тэмай. Эканоміцы ў цэлым, сельскай гаспадарцы ў прыватнасці — асаблівая ўвага.

## СПАСЫЛКІ НА АБСТАВІНЫ НЕ ПРЫМАЮЦЦА

Нездарма першыя пытанні на нараўлянскай зямлі былі адрасаваныя старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзю Салаўю — аб справах у рэгіёне, аб сітуацыі ў сельскай гаспадарцы.

На Гомельшчыне амаль завершана сяўба збожжавых, да 1 мая будзе пасеяна ўся кукуруза на «зялёнку», да 9 мая засеюцца асноўныя плошчы пад гэту культуру. Дажджы ў рэгіёне прайшлі напярэдадні візіту кіраўніка дзяржавы — упершыню за ўсю вясну, Нараўляншчыну яны захапілі, але колькасць вільгаці, якая трапіла ў глебу, тут пакуль невялікая. Запасы Днепра-Брагінскага вадасховішча дазволяць арасіць палі Лоеўскага і Брагінскага раёнаў, паведаміў кіраўнік аблвыканкама.

Паказчык валавога рэгіянальнага прадукту за першы квартал гэтага года на Гомельшчыне зменшыўся на 2,2 працэнта да леташняга ўзроўню, у асноўным праз падзенне аб'ёмаў перапрацоўкі нафты і транспарціроўкі газу. Тым не менш рэгіён выйдзе на рост у адзін працэнт па выніках года, запэўніў старшыня аблвыканкама. «Будзе нядрэнна, але ты нават не думай у выніку нейкіх там псіхозаў і пандэмій або эпідэмій скараціць вытворчасць!» — сказаў на гэта Прэзідэнт.

На заўвагу Генадзя Салаўя пра тое, што экспарт, у прыватнасці фарфору, цяпер спыніўся, кіраўнік дзяржавы адказаў: «Працуйце на ўнутраны рынак. ***Дамаўляйцеся — калі адновіцца ўся лагістыка і пачнуць працаваць суседзі, вы дамаўляйцеся, куды трэба. Калі ў вас будуць кантракты на пастаўкі пасля пандэміі, тады мы будзем думаць, як вам дапамагаць».*** Прэзідэнт заклікаў працаваць такім чынам па ўсіх кірунках — ад фарфору да прадукцыі «Гомсельмаша».

Пра стан у сельскай гаспадарцы па ўсёй краіне Прэзідэнту далажыў профільны міністр. За тры месяцы гэтага года аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі вырас да леташняга ўзроўню амаль на шэсць працэнтаў. Павялічыліся выручка ад яе рэалізацыі (на 13 працэнтаў) і аб'ём экспарту (амаль на 10 працэнтаў). АПК краіны за студзень—люты зарабіў каля мільярда долараў на знешніх рынках, але ў красавіку экспартныя продажы запаволіліся, цэны на біржах падаюць на сухое малако і пакуль трымаюцца на масла і сыры.

Азімыя сёлета добра перажылі самыя халодныя месяцы года, добра развіваюцца на Віцебшчыне, дзе на палях дастаткова вільгаці, горш — на астатняй тэрыторыі. У Беларусі пасеяна больш за 60 працэнтаў усіх яравых культур. У найбліжэйшыя дні будзе завершана сяўба лёну-даўгунцу, цукровых буракоў і бульбы. Для завяршэння сяўбы кукурузы, па падліках Мінсельгасхарчу, спатрэбіцца 19 дзён.

Запасаў аплачанага паліва ў сельгасарганізацыях краіны хопіць на 15 дзён палявых работ. Далей, дадажыў міністр, будзе весціся «работа па фінансаванні і авансаванні».

## НАСПЕЛА РЭВІЗІЯ ЧАРНОБЫЛЬСКІХ ЗЯМЕЛЬ

Што датычыцца пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы на Гомельшчыне, то кіраўніка дзяржавы найперш цікавілі недахопы адпаведнай дзяржаўнай праграмы. Генадзь Салавей звярнуў увагу на немагчымасць будаўніцтва жылля па гэтай праграме для спецыялістаў, якія жывуць у чыстай зоне, а працуюць у зоне адчужэння. «Разбяромся, — паабяцаў Прэзідэнт. — Нам трэба яшчэ раз праманіторыць гэту тэрыторыю».

Прэзідэнт распытаў старшыню Нараўлянскага райвыканкама Сяргея Дылюка пра сацыяльна-эканамічнае становішча раёна, мадэрнізацыю фабрыкі «Чырвоны Мазыранін», занятасць насельніцтва і пра тое, як выкарыстоўваецца запаведная зона, што займае палову тэрыторыі раёна.

Палескі радыеэкалагічны запаведнік развівае лесаперапрацоўку, пчалярства, конегадоўлю, турызм і рыбалоўства. Але гэтая работа, на думку беларускага лідара, вядзецца кропкава. Надышоў час напрацаваны вопыт распаўсюджваць і пашыраць. І марудзіць з гэтым нельга, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, заўважыўшы, што пакуль ніхто сур'ёзна не вывучаў перспектывы асваення чарнобыльскіх тэрыторый. «Трэба Міністэрству сельскай гаспадаркі ўзначаліць гэту работу — прарэвізаваць усё», — сказаў ён. ***«Калі мы можам узяць тут мёд, трэба больш гэта развіваць. Калі можна развіваць лесапілаванне — перапрацоўку, значыць, трэба больш, бо спелых лясоў шмат,*** — лічыць Прэзідэнт. — ***Калі конегадоўлю можна, дык давайце будзем развіваць! Але мы пакуль не ведаем дэталёва, на якім узроўні знаходзімся і за кошт чаго можам дадаць. Таму трэба прарэвізаваць Брагін, Нароўлю, Хойнікі...»***

Беларускі лідар даручыў Міністэрству па надзвычайных сітуацыях далажыць яму і пра перспектывы 30-кіламетровай зоны.

## «НЕЛЬГА КІДАЦЬ НІВОДНАГА ГЕКТАРА ЗЯМЛІ»

Аляксандр Лукашэнка быў падрабязна праінфармаваны пра асаблівасці і перспектывы работы аднаго з найбуйнейшых у рэгіёне сельгаспрадпрыемстваў — КСУП «Саўгас-камбінат «Зара» і ў тым ліку яго аддзяленняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Нараўлянскага раёна (само прадпрыемства адносіцца да Мазырскага раёна). Прэзідэнта пазнаёмілі з тэхналогіяй вырошчвання кукурузы на зерне і рэалізацыяй праекта па рэканструкцыі памяшканняў былога свінакомплексу пад малочнатаварную ферму ў вёсцы Завайцы.

«Гэта добры вопыт, — падсумаваў ён. — Трэба яшчэ раз зірнуць на гэтыя тэрыторыі, у тым ліку запаведныя. ***Нам давядзецца на гэтых тэрыторыях ствараць такія вось вытворчыя аб'яднанні або холдынгі.*** Улада ёсць, старшыні райвыканкамаў ёсць — трэба падумаць, якія холдынгі ствараць. У іх будзе некалькі кірункаў, напрыклад, лесаперапрацоўка, вытворчасць мёду, конегадоўля, авечкагадоўля, яшчэ нешта, і сельскагаспадарчы кірунак. ***Вось такія холдынгі трэба ствараць, не кранаючы землі, якія ўжо нармальна асвоеныя і прыносяць карысць дзяржаве».***

Размова пра шматгаліновыя вытворчыя аб'яднанні, растлумачыў Прэзідэнт. Ён загадаў, каб кіраўнікі названых раёнаў разгледзелі гэтае пытанне разам з Мінсельгасхарчам і ўнеслі адпаведную прапанову. Яшчэ адзін шлях — развіццё сыравінных зон для малакаперапрацоўчых камбінатаў, але што датычыцца рэабілітацыі забруджаных тэрыторый, то тут, на думку Аляксандра Лукашэнкі, толькі раслінаводствам абмяжоўвацца немэтазгодна.

«Калі трэба пад гэтыя холдынгі нешта — ну, будзем шукаць, — паабяцаў ён. — ...Нам трэба, не губляючы часу, зараз гэтым заняцца і накіраваць, скажам, асноўныя «чарнобыльскія сродкі» на гэтыя вытворчыя аб'яднанні. Каб мы ахапілі ўсё і ўвайшлі ў гэтую вось забароненую 30-кіламетровую зону. Сёлета я павінен там пабываць улетку. Але да гэтага часу каб падрыхтавалі і МНС далажылі мне ўсё, што яны там будуць рабіць. ***Нельга кідаць ніводнага гектара зямлі.*** Мы ў гэтым упэўніліся...»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як падтрымаў некалі прапанову вучоных і кіраўніцтва Гомельскай вобласці аб вяртанні ў абарот забруджаных зямель пры ўмове атрымання з іх чыстых прадуктаў — і цяпер ёсць вынік.

«Трэба ісці далей — запаведная зона і зона, груба кажучы, за калючым дротам, — упэўнены беларускі лідар. — Што будзем там рабіць? Ці мы там увогуле пакуль не будзем нічога чапаць, там будзе навука працаваць, займацца, ці мы ўжо туды свой позірк можам кінуць па нейкіх кірунках?»

## ЖЫЦЬ МОЖНА І ТРЭБА

Аляксандру Лукашэнку паказалі новыя жылыя дамы ў Завайцы, пабудаваныя Светлагорскім домабудаўнічым камбінатам. Пасля гэтага кіраўнік дзяржавы ўсклаў кветкі да помніка адселеным вёскам Нараўлянскага сельсавета і пагутарыў з мясцовымі жыхарамі. З яго вуснаў прагучалі і словы падтрымкі, і парады, і настаўленні.

Прэзідэнт упэўнены: сродкі дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС трэба выкарыстоўваць комплексна. ***«Нам неабходна сканцэнтраваць тыя невялікія сродкі, якія ў нас ёсць па чарнобыльскай лініі. Плюс калі вы будзеце асвойваць гэтыя сродкі для жыцця людзей і атрымліваць прадукцыю, будзеце працаваць, мы грошы знойдзем. Галоўнае, каб тут расхлябанасці не было, каб вы шчыра працавалі, бераглі тэхніку, калі вы на зямлі працуеце, і выдавалі тую прадукцыю, якую сёння можна прадаць.*** Будзеце працаваць — мы будзем вас падтрымліваць усё ў большых і большых аб'ёмах», — адзначыў Прэзідэнт, адказваючы на пытанне наконт будучай падтрымкі пацярпелых раёнаў.

Улады пагледзяць на перспектывы рэгіёнаў і ў плане вытворчасці, і ў плане арганізацыйных формаў. Магчыма, варта аднавіць калгасы ці аддаць землі фермерам. Як прыклад удалай ініцыятывы кіраўнік краіны назваў гаспадарку «Зара», якая ўзяла былыя калгасы ў Нараўлянскім раёне, далучыла іх землі і вырошчвае кармы для сваіх фермаў і птушкафабрыкі.

Ён нагадаў аб праекце, які трымалі «на алоўку» раней, — чыгунку з Жыткавіч на Мазыр. Тады на маштабную дзейнасць не было сродкаў. Але настаў час вярнуцца да гэтага пытання, пралічыць эканамічна і сацыяльна.

Адно з пытанняў жыхароў датычылася меліярацыі. Праблема тут, па словах Прэзідэнта, заключаецца ва ўтрыманні пасяўных плошчаў, бо «прырода вае, яна хоча вярнуць гэтыя землі».

«І там, дзе мы праваранілі, туды адпраўляю меліяратараў, каб яны аднавілі гэтыя плошчы. Дадаткова асушаць нейкія балоты я не планую», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што ў Гомельскай вобласці сітуацыя з аднаўленнем меліярацыйных сістэм яшчэ не самая горшая.

## ЧАС БЕРАГЧЫ СЯБЕ

У размове з жыхарамі Нараўлянскага раёна Аляксандр Лукашэнка закрануў і тэму, якая цяпер хвалюе ўсіх. Ён паўтарыў, што пасля пандэміі COVID-19 свет будзе іншы, і беларусам трэба думаць на перспектыву. Каб пазбегнуць залежнасці ад больш магутных і багатых краін, захаваць самастойнасць у прыняцці рашэнняў, Беларусь не стала спыняць эканоміку, растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Шлях барацьбы з пандэміяй, які абрала наша дзяржава, дазволіць таксама пазбегнуць другой хвалі захворвання пасля зняцця каранціну ва ўсім свеце. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе меры ў Беларусі прымаюцца адпаведна абстаноўцы.

«Мы не зачынілі краіну, не спынілі вытворчасці. На Вялікдзень і я, і людзі хадзілі ў царкву. На Радаўніцу — ну як я магу забараніць чалавеку пайсці пакланіцца бацькам? А не дай Бог у кагосьці дзеці загінулі... ***Я толькі магу рэкамендаваць і прасіць: пашкадуйце сябе»,*** — сказаў ён і дадаў, што паніка толькі ўскладняе хваробы.

Развітваючыся з жыхарамі раёна, Аляксандр Лукашэнка адзначыў аптымізм і прагу да жыцця людзей, якія тут жывуць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Марыя ДАДАЛКА,**
*Нараўлянскі раён.*

# «Без малой радзімы не можа быць ні краіны, ні незалежнасці»

**Падчас рэспубліканскага суботніка Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка высадзіў дрэвы на тэрыторыі Нацыянальнага парку «Прыпяцкі»**

**Сёлета, у 2020 годзе, каманда Прэзідэнта высадзіла восем тысяч саджанцаў сасны на плошчы паўтара гектара ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна. Пасля кіраўнік краіны адказаў на пытанні журналістаў, якія працавалі на суботніку разам з ім.**

У прыватнасці, ён паведаміў, што Пасланне парламенту і народу краіны, якое планавалася на сярэдзіну красавіка, адбудзецца пазней, бо ёсць шмат пытанняў, на якія ва ўмовах пандэміі COVID-19 няма адназначных адказаў. «Па нейкіх іншых пытаннях мы можам адназначна даць адказ — асноўныя, дапусцім, параметры і пытанні будучай пяцігодкі. Потым — пытанне Канстытуцыі (яно ж не здымаецца). Тут адназначна можна адказаць, што мы ў новай пяцігодцы хутчэй за ўсё будзем мець новую Канстытуцыю», — перадае словы Прэзідэнта БелТА.

Другое пытанне журналістаў датычылася папярэдніх вынікаў трох гадоў, прысвечаных у Беларусі малой радзіме. Падчас трылогіі, на думку Прэзідэнта, зрабілі не ўсё, што маглі. Але справіліся з галоўным — павярнулі людзей да іх каранёў. «Пачынаючы ад Мінска, буйных гарадоў, усе вёсачкі, свабодныя прысядзібныя ўчасткі скуплены: нехта маленькі дом пабудаваў, нехта вялікі, нехта церам — калі ласка. Галоўнае, каб гэтая зямля апынулася ў руках гаспадароў. Гэта значыць, за тры гады мы павярнулі свядомасць людзей і нацэлілі іх на тое, што без малой радзімы, асабліва без вёскі, не можа быць ні краіны, ні суверэнітэту і незалежнасці», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У прысутнасці тэлекамер Прэзідэнт таксама абмеркаваў па тэлефоне з бізнесменам Міхаілам Гуцэрыевым планы пастаўкі ў мінскія паліклінікі дзесяць камп'ютарных тамографаў, якія прымяняюцца ў тым ліку для дыягностыкі пнеўманіі. Падобнае абсталяванне кіраўнік краіны хоча размясціць у кожным раёне Мінска.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Агульная добрая справа


Фота БелТА.

У рэспубліканскім суботніку ўзялі ўдзел і іншыя вышэйшыя службовыя асобы краіны. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка разам з супрацоўнікамі Адміністрацыі садзіў дрэвы каля ўваходнай групы стадыёна «Дынама», старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава працавала на пасадцы дрэў у парку каля сталічнай гасцініцы «Пекін», старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка — у парку «Цівалі», апарат Саўміна на чале з прэм'ерам Сяргеем Румасам высаджваў лес у Капыльскім раёне. На добраўпарадкаванні тэрыторый працавала і кіраўніцтва ўсіх аблвыканкамаў.

Увогуле ў суботніку ўзяло ўдзел прыблізна 2,3 мільёна беларусаў, сабрана каля Br8,7 млн. Віцэ-прэм'ер Уладзімір Кухараў паведаміў, што 50 % сабраных грошай застаецца ў распараджэнні аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. Яны будуць накіраваны на добраўпарадкаванне населеных пунктаў, месцаў пахавання, дзіцячых лагераў. Яшчэ 50 % пойдзе на будаўнічыя работы ў Нацыянальным мастацкім музеі і рэканструкцыю комплексу на месцы спаленай вёскі Ала ў Светлагорскім раёне.

| ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 | ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком<br>✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения<br>✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения |
|---|---|

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод», тел. 8 (0232) 21 60 07**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, руб. с НДС | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Обрабатывающий центр CW1000 с инв. № 2067, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **10 000,00** | **1 000,00** |
| 2 | Координатно-расточной станок BRoZ 900x1400/5 с инв. № 1418, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **8 334,00** | **833,40** |
| 3 | Станок консольно-фрезерный вертикальный 6М13П с инв. № 735, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **3 334,00** | **333,40** |
| 4 | Станок токарно-винторезный 250ИТВМ01, инв. № 2323, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9 | **3 334,00** | **333,40** |

| | |
|---|---|
| **Срок и место подачи заявления** | **По 08 мая 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **11 мая 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 29.04.2020 г. |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %, заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**


# Арэндныя канікулы і сацыяльная падтрымка

## У галіне кантрольнай дзейнасці

Міністрам аховы здароўя, антыманапольнага рэгулявання і гандлю, а таксама старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі дадзена права прыпыняць работу гандлёвага аб'екта, аб'екта грамадскага харчавання да ліквідацыі парушэнняў (але не больш чым на 90 дзён) у выпадку ўстанаўлення па выніках праверкі парушэнняў заканадаўства, кантроль за выкананнем якога адносіцца да кампетэнцыі адпаведнага ведамства. Гэтая мера накіравана на павышэнне дысцыпліны ў рабоце суб'ектаў гаспадарання, асабліва неабходнай ва ўмовах бягучай эканамічнай і эпідэміялагічнай сітуацыі.

## У сферы працоўных адносін

У мэтах захавання занятасці і павелічэння працоўнай мабільнасці скарочаны мінімальны тэрмін папярэджання работнікаў аб змяненні наймальнікам істотных умоў працы (без змяншэння памераў аплаты працы). Таксама падоўжаны да трох месяцаў тэрмін магчымага часовага пераводу работнікаў у сувязі з вытворчай неабходнасцю, з-за неспрыяльнага ўздзеяння эпідэміялагічнай сітуацыі, а таксама для замяшчэння адсутнага работніка.

## Меры сацыяльнай падтрымкі

Прадугледжана выплата дапамогі па часовай непрацаздольнасці асобам, што ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 10 гадоў, якое наведвае дашкольную ўстанову або ўстанову агульнай сярэдняй адукацыі, калі гэтае дзіця адносіцца да кантактаў першага або другога ўзроўню.

У мэтах спрашчэння працэдур закупак заказчыкам дадзена права на дзяржзакупкі з адной крыніцы (у аб'ёме, неабходным для забеспячэння патрэб на працягу двух месяцаў) у выпадку, калі дагавор з ранейшым пастаўшчыком скасаваны.

Пры гэтым пастаўшчыкі, якія не выканалі свае абавязацельствы і вымушаны скасаваць дагавор па аб'ектыўных прычынах, часова не будуць уключацца ў спіс нядобрасумленных пастаўшчыкоў.

Для таго каб урад мог аператыўна і гібка рэагаваць на пагаршэнне эпідэміялагічнай сітуацыі, яму дадзена права на прыняцце спецыяльнага часовага парадку ажыццяўлення дзяржаўных закупак, калі гэта спатрэбіцца.

Вызначана, што запазычанасць за энергарэсурсы ў замежнай валюце пагашаецца па курсе рубля, устаноўленым Нацыянальным банкам на 31 снежня 2019 года да замежнай валюты, якая выкарыстоўваецца для разлікаў за энергарэсурсы.

Прадугледжваецца пашырэнне нормы аб падставах субсідыярнай адказнасці, устаноўленай у падпункце 5.6 пункта 5 Дэкрэта № 7 ад 23 лістапада 2017 года «Аб развіцці прадпрымальніцтва», на адносіны, што ўзніклі да прыняцця дэкрэта.

Указам прадугледжваюцца і іншыя нормы і палажэнні, якія дадуць магчымасць падтрымаць работу суб'ектаў гаспадарання і захаваць працоўныя калектывы ва ўмовах запавolення эканамічнай актыўнасці.

**Паводле БелТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**ДАРЭЧЫ**

По стане на 28 красавіка паправіліся і выпісаныя 1993 пацыенты, у якіх раней быў пацверджаны дыягназ COVID-19.

Зарэгістравана 12 208 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19, што складае 7,5 % ад колькасці праведзеных тэстаў. Усяго праведзена 161 028 тэстаў.

За ўвесь перыяд распаўсюджвання інфекцыі на тэрыторыі краіны памерлі 79 пацыентаў з шэрагам хранічных захворванняў з выяўленай каранавіруснай інфекцыяй.


**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «Комплайнинвест»**

(УНП 192936454, г. Минск, пр-т Партизанский, д. 23А, пом. 1Н, комната 1),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов***: **15 мая 2020 года**. Начало – 12.00. Заявки принимаются с 29 апреля 2020 года по 13 мая 2020 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, просп. Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. 8 (033) 653-38-17.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 233/С-1648 (назначение – здание специализированное финансового назначения, наименование – здание банка), 1994 года постройки, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, ул. Энергетиков, 13, площадь – 918,7 кв. м.<br>Сведения о земельном участке: кадастровый номер участка – 225151000002000110 в праве постоянного пользования, площадь земельного участка – 0,2625 га, назначение – земельный участок для использования под административное здание | 394 724,40 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п.2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |

Для участия в торгах необходимо:

1. **В срок до 17.00 13 мая 2020 года перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».**

2. **Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 13.05.2020 заявление на участие в торгах** с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 215 (29082) за 13.11.2019.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 18 (29132) за 29.01.2020.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 47 (29161) за 10.03.2020.

УНП 300042199



**ОАО «НАФТАН» реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

| Пометка на конверте | Наименование | Инв. № | Год ввода в эксплуатацию | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|---|
| Реализация неликвидов, Нафтан, 28.05.2020 | Электродвигатель 1ВАО 315OL-0,38-8У2 | 06270552 | 2007 | 850,00 | 1020,00 |
| | Распредпункт ПР-24-7214 | 06257060 | 2002 | 184,90 | 221,88 |
| | Распредпункт ПР-24-7214 | 06257061 | 2002 | 184,90 | 221,88 |
| | Плотномер DM-230.2 | 08158045 | 2009 | 2847,16 | 3416,59 |
| | Плотномер DM-230.2 | 08158046 | 2009 | 2847,16 | 3416,59 |
| | Цистерна съемная 2 м³ | 06273326 | 2009 | 6418,73 | 7702,47 |
| | Цистерна съемная 2 м³ | 06273327 | 2009 | 6418,73 | 7702,47 |
| | Машина маркировочная ММ-4М | 06270701 | 2007 | 1913,60 | 2296,32 |
| | Теплообменник ГКВ-800, Х-106/3 | 06271063 | 2007 | 6146,25 | 7375,50 |
| | Холодильник Х-60 | 06267511 | 2005 | 2400,56 | 2880,68 |
| | Борона для гравия | 06270543 | 2007 | 55,00 | 66,00 |
| | Борона для гравия | 06270544 | 2007 | 55,00 | 66,00 |
| | Погрузчик-экскаватор 702А 01 | 06269250 | 2006 | 7250,00 | 8700,00 |
| | Снегоочиститель тракторный СТ-1500 | 06280445 | 2013 | 110,00 | 132,00 |
| | Пневмоконструкция «Горка 5,5*3*5 м» (инв. №) | 16316596 | 2013 | 376,00 | 451,20 |
| | Пневмоконструкция «Батут клоуны 4,5х3,7 с подушкой 1,2х3,7» | 16316598 | 2013 | 244,00 | 292,80 |
| | Станок 2012 | 06000142 | 1996 | 200,00 | 240,00 |
| | Агрегат сварочный дизельный АДД-4004 | 06274841 | 2010 | 4600,00 | 5520,00 |
| Реализация неликвидов, Полимир, 28.05.2020 | Резательная машина | 195111 | 2004 | 1032,00 | 1238,40 |
| | Резательная машина | 195112 | 2004 | 1032,00 | 1238,40 |
| | Резательная машина МРБ-100 | 195349 | 2005 | 4152,00 | 4982,40 |
| | Преобразователь частоты VLT-2855 | 202470 | 2004 | 136,00 | 163,20 |
| | Танк-контейнер двадцатифутовый наливной – 11 штук | 166885 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166906 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166913 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166919 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166921 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166924 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166936 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166938 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166943 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166947 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 166948 | 1987 | 6875,00 | 8250,00 |
| | Танк-контейнер – 7 штук | 169144 | 2001 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 169145 | 2001 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 169147 | 2001 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 169150 | 2001 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 169151 | 2001 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 169153 | 2001 | 6875,00 | 8250,00 |
| | | 169154 | 2001 | 6875,00 | 8250,00 |

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу:
**211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30**
по местному времени **28 мая 2020 года** с пометками на конверте, указанными в таблице, либо в электронной форме на e-mail: **tender.box@naftan.by** с вышеуказанными пометками.
Извещения на проведение конкурсов размещены на сайте **www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8 (0214) 59-87-83, 8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42, 8 (0214) 59-88-01.**


## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Лівійская нацыянальная армія бярэ на сябе кіраванне краінай



Пра гэта заявіў у відэазвароце да нацыі сам яе камандуючы — фельдмаршал Халіфа Хафтар, перадае тэлеканал Sky News Arabia. «Генеральнае камандаванне ўзброеных сіл прымае на сябе кіраўніцтва краінай і аб'яўляе аб спыненні дзеяння Схірацкага пагаднення (паводле якога ў снежні 2015 года быў створаны ўрад нацыянальнай згоды, што так і не атрымаў адабрэння парламента. — **«Зв.»**), — паведамляецца ў апублікаванай заяве Хафтара. — Нягледзячы на вялікі цяжар адказнасці, мы прымаем волю народа». Па словах фельдмаршала, ЛНА будзе працаваць над стварэннем умоў для фарміравання пастаянных грамадзянскіх інстытутаў дзяржавы.

### Улады Новай Зеландыі аб'явілі аб перамозе над эпідэміяй




Прэм'ер-міністр Новай Зеландыі Джасінда Ардэрн заявіла, што краіне «ўдалося пазбегнуць горшага» ў сувязі з эпідэміяй каранавіруснай інфекцыі. На працягу некалькіх апошніх дзён у гэтай краіне выяўляюць толькі адзінкі новых выпадкаў заражэння. Па словах Ардэрн, у краіне ўдалося спыніць некантраляванае распаўсюджванне інфекцыі, перадае The Guardian. Новая Зеландыя зняла частку абмежаванняў. Аднаўляюць работу прадпрыемствы, фірмы, школы.

### У Балгарыі плануюць пачаць позні турыстычны сезон



Пра гэта паведаміла Балгарскае нацыянальнае радыё са спасылкай на міністра турызму краіны Нікаліну Ангелкову. Міністэрства мяркуе пачаць у сярэдзіне мая падрыхтоўку да позняга летняга турыстычнага сезона. Як чакаецца, ён распачнецца 1 ліпеня, удакладняе радыёстанцыя. Доля турызму ў фарміраванні ВУП Балгарыі складае 12 працэнтаў, у гэтай сферы задзейнічана 11 працэнтаў работнікаў. На брыфінгу Нікаліна Ангелкова заявіла, што менавіта таму для краіны вельмі важна як мага хутчэй аднавіць турыстычны сектар. Яна таксама заклікала работнікаў гэтай сферы забяспечыць высокую якасць паслуг.

Профі

# КАЛІ АДЛІК ІДЗЕ НА СЕКУНДЫ



**Дэпартамент аховы нездарма лічыцца адной з самых мабільных службаў у сістэме Міністэрства ўнутраных спраў. Гэтая рэпутацыя створана дзякуючы нарадам груп затрымання. Іх альфа і амега — аператыўнае рэагаванне на любыя падзеі, якія пагражаюць жыццю і здароўю людзей або іх маёмасці.**

Але з выгляду супрацоўнікі Дэпартамента нічым не адрозніваюцца ад іншых супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Сакрэт іх поспеху — у пастаянных трэніроўках і рабоце над сабой.

Пра асаблівасці службы расказаў **начальнік Кастрычніцкага (горада Мінска) аддзела Дэпартамента аховы МУС Беларусі палкоўнік міліцыі Аляксандр ЦІХАНОВІЧ.**

Рабочая змена ў групы затрымання доўжыцца 12 гадзін. Байцы загадзя прыбываюць у падраздзяленне, атрымліваюць зброю, экіпіруюцца і праходзяць інструктаж. Пасля гэтага яны выязджаюць на маршруты патрулявання.

— Нашы супрацоўнікі на высокім узроўні падрыхтаваны не толькі фізічна, але і псіхалагічна. Гэта дазваляе ім дзейнічаць у самых розных абставінах, у тым ліку і нестандартных, — адзначае Аляксандр Ціхановіч.

У пачатку снежня спрацавала кнопка трывожнай сігналізацыі ў адным з гандлёвых цэнтраў Мінска. Туды экстранна выехаў нарад групы затрымання. Прычына выкліку аказалася даволі трывіяльная: адзін з пакупнікоў доўга выбіраў сабе куртку, а калі ўсё ж вызначыўся, то паспрабаваў выйсці проста ў ёй за межы магазіна, не заплаціўшы за пакупку. Спрацавала антыкрадзежная сістэма. Работнікі крамы спынілі пакупніка і тут жа звярнуліся ў міліцыю. Зладзюжка, у сваю чаргу, вырашыў разыграць сцэнку: ён лёг на падлогу і сам сабе выклікаў хуткую дапамогу. Медыкам, якія прыехалі на выклік, ён растлумачыў, што праглынуў завостраныя манеты. Пад пільным наглядам супрацоўнікаў Дэпартамента аховы яго павезлі на рэнтген, які паказаў, што ў страўніку сапраўды знаходзяцца металічныя прадметы. Але навошта іх было глытаць, чалавек так і не адказаў.

## ВІДЭАПАДРУЧНІК І ІНТЭРАКТЫЎНЫ ЦІР

Кожны міліцыянер групы затрымання атрымлівае новыя веды ўвесь час, пакуль служыць. Яму трэба пастаянна быць гатовым да таго, што ў любы момант можа пачацца супрацьстаянне з узброеным злачынцам.

— На базе нашага аддзела створаны сапраўдны вучэбны палігон, — расказвае Аляксандр Ціхановіч. — Ён складаецца з некалькіх навучальных месцаў. Там змадэляваны кватэра, офіс, банкамат. Усе гэтыя пункты абсталяваны сродкамі ахоўнай сігналізацыі. Гэта дазваляе пастаянна адпрацоўваць тактыку дзеянняў нарадаў групы затрымання, калі паступае сігнал трывогі. Дзейнічае ў нас і інтэрактыўны цір — там нашы супрацоўнікі вучацца правілам і прыёмам стральбы з пісталета Макарава і аўтамата Калашнікава. У навучальным класе мы паказваем вучэбныя фільмы. Яны прысвечаны, з аднаго боку, прыкладам узорнага нясення службы, а з другога — дазваляюць лепш аналізаваць дапушчаныя памылкі і пралікі. Створана і выдатная спартыўная база. Тры залы выдзелены для заняткаў на трэнажорах, барацьбы і гульнявых відаў спорту — міні-футбола, валейбола, баскетбола.

## ДВАЙНОЕ ЗЛАЧЫНСТВА ДАПАМАГЛІ РАСКРЫЦЬ САБАКІ

Кіналагічныя разлікі — неад'емная частка аддзела Дэпартамента аховы. У асноўным службу нясуць нямецкія аўчаркі, алё ёсць і бельгійскія, у прыватнасці малінуа. Час работы сабакі наўпрост звязаны з графікам міліцыянера-кінолага. Супрацоўнік мусіць абавязкова выгуляць і накарміць жывёлу. Маршрут патрулявання пры гэтым распрацаваны такім чынам, каб была магчымасць раз на паўтары гадзіны даць пабегаць чатырохлапаму памочніку.

На тэрыторыі Кастрычніцкага аддзела Дэпартамента аховы МУС размешчаны гадавальнік службовых сабак Мінскага гарадскога ўпраўлення дэпартамента. Яны выкарыстоўваюцца для работы па ўсім горадзе. Іх місія — не толькі ўзмацніць нарады падчас патрулявання ў складзе груп затрымання: яны таксама дапамагаюць ахоўваць грамадскі парадак. Тут абсталявана спецыяльная паласа перашкод для дрэсіроўкі, і штотыдзень не менш за чатыры гадзіны кінолагі працуюць над тым, каб кожны рух, кожны навык сабакі падчас затрымання злачынца быў адточаны да аўтаматызму.

Просім расказаць некалькі прыкладаў, калі службовы сабака дапамог абясшкодзіць зламысніка.

— У лютым гэтага года ад дзяжурнага Заводскага РУУС Мінска нарадам паступіла паведамленне пра тое, што хтосьці разбіў у краме шыбу і ўцёк. Да магазіна неадкладна выехала група затрымання Заводскага аддзела Дэпартамента аховы, — згадвае Аляксандр Ціхановіч. — На месцы падзей відавочца расказаў міліцыянерам, што літаральна за дзесяць хвілін да таго з акна крамы выскачыў мужчына і пабег у лес. Байцы тут жа адправіліся прачэсваць масіў у раёне Партызанскага праспекта. Прыблізна праз трыста метраў яны заўважылі чалавека з сумкамі, які відавочна ўцякаў. Прагучала патрабаванне спыніцца. Мужчына папярэджанне праігнараваў. У выніку яго за лічаныя секунды дагнала аўчарка. Пасля высветлілася, што ў сумках знаходзіліся тры бензапілы агульную суму больш за 2,5 тысячы рублёў. А наш герой аказаўся раней судзімы.



У канцы лістапада ў Першамайскае РУУС Мінска звярнуліся супрацоўнікі адной з шаурменных. Яны паведамілі пра тое, што хтосьці ўзламаў акно ў рабочым памяшканні. Адтуль зніклі электрачайнік, грыль-печ і... уся выручка. Памяшканне было абсталявана сістэмай відэаназірання. Запісы з камер сышчыкі вывучылі вельмі хутка, склаўшы партрэт меркаванага злачынцы. На месца разбіральніцтва тым часам прыбыў кіналагічны разлік. Службовы сабака Аза тут жа ўзяў след і пацягнуў за сабой гаспадара. Больш за паўтара кіламетра нямецкая аўчарка ішла па следзе. Нарэшце, павярнуўшы ў чарговы двор, каля пад'езда аднаго са шматпавярховікаў міліцыянеры ўбачылі маладога чалавека, што па прыкметах быў вельмі падобны да злодзея, якога шукалі. Сабака пачаў падаваць голас. 26-гадовы жыхар Мінскага раёна адпіраецца не стаў. Ён прызнаў тое, што меў дачыненне да крадзяжу, і выдаў усе скрадзеныя рэчы, якія захоўваліся ў кватэры знаёмага.

Праўда, гэтая справа мела вельмі нечаканы працяг. У той жа дзень увечары ў Першамайскае РУУС паступіла яшчэ адно паведамленне аб незаконным пранікненні ў памяшканне. Гэтым разам гаворка ішла ўжо аб прыватным доме. Гаспадары, якія звярнуліся ў міліцыю, расказалі, што нехта прабраўся да іх праз акно, але нічога не скраў. На месца здарэння выехаў кіналагічны разлік Дэпартамента аховы. Аўчарка на мянушку Ларнака тут жа ўзяла след. Яна доўга круцілася па раёне, але ў рэшце рэшт прыйшла... да той самай шаурменнай, пра якую ўжо апавядалася вышэй. І далей маршрут Ларнакі цалкам супаў з тым, які некалькімі гадзінамі раней міліцыянеры ўжо прайшлі. Зладзюжка запірацца не стаў і прызнаўся, што да таго, як залезці ў шаурменную, вырашыў папытаць шчасця ў тым самым прыватным доме. Але нічога каштоўнага, па яго словах, ён там не знайшоў і таму для ўзбагачэння выбраў ужо іншы аб'ект.

Увогуле сабака для міліцыянера-кінолага — гэта перш за ўсё баявы сябар. Яшчэ шчанюкамі жывёлы штатна замацоўваюцца за кінолагамі. Яны могуць жыць або дома ў сваіх гаспадароў, або ў гадавальніку. На жаль, працоўны век сабакі нядоўгі — «пенсія» для іх настае ва ўзросце васьм–дзесяці гадоў. У 80 % выпадкаў чатырохлапых напарнікаў забіраюць сабе дадому кінолагі, з якімі яны неслі службу. Калі ж такой магчымасці няма — сабаку перавядуць на вартавую службу на ахоўных аб'ектах.





## СЛУЖБА — ДНІ І НОЧЫ

Летась нарады груп затрымання аддзела выбывалі па сігналах больш за 10 тысяч разоў. Колькасць выездаў па краіне і ўвогуле перасягнула праз паўмільёна. Але ці заўжды гэта выключна спрацоўваюць сігналізацыі?

— Насамрэч, не, хоць яны і складаюць пераважную большасць выпадкаў, — кажа Аляксандр Ціхановіч. — Але тым не менш затрымана больш за 1800 злачынцаў, якія не толькі квапіліся на ахоўныя аб'екты, але і пагражалі жыццю і здароўю мірных людзей. Прычым толькі за першы квартал гэтага года нашы байцы абясшкодзілі 240 зламыснікаў. Часцей за ўсё нагодай для баявога выезду становіцца дробныя крадзяжы, рабаванні, хуліганствы, разбоі. Але ёсць і іншыя прычыны — напрыклад, адключэнне электраэнергіі, пажар і нават памылковыя дзеянні гаспадара памяшкання. Гэта значыць, ён увайшоў у кватэру, а з сігналізацыі зняць яе забыўся. Ці, напрыклад, яго хатні гадаванец так падрос, што патрабуецца пераналадка сістэмы, каб яна спрацоўвала на больш габарытны аб'ект.

Нярэдка нашы супрацоўнікі выязджаюць у месцы, дзе бывае шмат людзей. Гэта перш за ўсё крамы і гандлёвыя цэнтры, дзе перыядычна ўзнікаюць канфліктныя сітуацыі і здзяйсняюцца дробныя крадзяжы. Шмат спрэчак і часам нават боек адбываецца ў забаўляльных установах, калі іх наведвальнікі добра разгарачаны алкаголем.

## БЫЦЬ НА КРОК НАПЕРАДЗЕ

Доўгія гады сігналізацыя працавала наступным чынам: пасля адкрыцця кватэры ў яе гаспадара было прыкладна каля хвіліны, каб патэлефанаваць у Дэпартамент аховы і назваць кодавае слова. Час на месцы не стаіць, і ў канцы 1990-х былі распрацаваны больш надзейныя тэхнічныя сродкі. Мадэрнізацыя іх працягваецца і цяпер.

— Напрыклад, у нас паспяхова рэалізаваны праект па ўкараненні аўтаматызаванага рабочага месца, — працягвае суразмоўца. — Сістэма дазваляе групам затрымання ў рэжыме рэальнага часу кантраляваць сітуацыю на ахоўных аб'ектах. З яе дапамогай вызначаецца самы кароткі маршрут да месца выкліку. Супрацоўнікі, атрымаўшы сігнал трывогі, ужо з дарозе могуць скарыстацца звесткамі пра ўсе патрэбныя характарыстыкі аб'екта, вывучыць яго планіроўку. Такая сістэма эксплуатуецца цяпер усімі групамі затрымання аддзела. Пастаянна абнаўляецца і аўтапарк. У нас няма аўтамабіляў, выпушчаных раней за 2013 год.

Адным словам, нашу маёмасць ёсць каму берагчы.

**Фота дадзена Дэпартаментам аховы МУС.**

Тэма

# КАРАНАВІРУС ЯК ПОЛЕ ДЛЯ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

**Абвешчаная пандэмія COVID-19 змяніла за паўтара месяца безліч сацыяльных працэсаў у свеце. Аказала яна ўплыў і на праявы крыміналу. У сакавіку 2020 года Еўрапол выпусціў спецыяльны даклад на тэму таго, як злачынцы эксплуатуюць сітуацыю з COVID-19. Сярод фактараў уплыву — высокі попыт на пэўныя тавары, зніжэнне мабільнасці людзей, большае выкарыстанне лічбавых тэхналогій і інтэрнэту, павелічэнне трывогі. Як жа гэта працуе ў Беларусі?**




## БІЗНЕС — НІЧОГА АСАБІСТАГА

Нядаўна ўрад Беларусі прыняў рашэнне аб тым, што медыцынскія маскі і іншыя сродкі індывідуальнай абароны, зробленыя на любым суб'екце гаспадарання незалежна ад яго формы ўласнасці, могуць адгружацца выключна ў адрас двух прадпрыемстваў — «Фармацыя» і «Белмедтэхніка». Менавіта ім даручана насыціць рынак Беларусі гэтымі рэчамі. Але нават у такіх умовах знайшліся дзяўкі, якія захацелі зарабіць звышдаходы на такіх неабходных сёння сродках індывідуальнай абароны. Прадпрыемства пажадала прадаць маскі камерцыйным структурам па трывіяльнай прычыне — яны больш плацяць. Калі дзяржаўная ўстанова гатова заплаціць за адну штуку 10 капеек, то прайс камерсантаў — рубель за маску. Натуральна, што цана, якую плаціў за яе канчатковы пакупнік, была яшчэ вышэйшая.






21 красавіка ў Мінску супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы ўраджэнец Мексікі. Нелегальным мігрантам госць з амерыканскага кантынента ў Беларусі не быў — у яго ёсць дазвол на пражыванне ў нашай краіне. Цікавіла аператыўнікаў іншае. Замежніка спынілі якраз у той момант, калі ён на мікрааўтобусе вёз маскі, вырабленыя на адным з мінскіх прадпрыемстваў. Ды і партыя была, мякка кажучы, унушальная — 164 тысячы адзінак. Падчас разбору высветлілася, што гэтае ж прадпрыемства раней ужо рэалізавала яму 408 тысяч масак.

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі высветлілі, што за два няпоўныя месяцы прадпрыемства прадало прыватным структурам амаль тры мільёны масак. Лічба касмічная. Асабліва калі ўлічыць, што толькі 10 % ад гэтай колькасці было адгружана ў адрас «Фармацыі» і «Белмедтэхнікі».

Яшчэ адзін хітры вытворца знайшоўся ва Уздзе. Ён паведаміў адпаведным структурам пра тое, што маскі рабіць не можа. Прычына — абсталяванне няспраўнае, ды і з набыццём сыравіны вялікія праблемы. Але, як зазначылі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, вытворчасць у цэхах літаральна буяла. Кожныя суткі прадпрыемства адгружала звыш 30 тысяч масак. Сумарна «налева» пайшло каля 450 тысяч вырабаў. Падчас вобыску аператыўнікі знайшлі таксама 56 тысяч паўфабрыкатаў — масак, якія былі збольшага гатовы, — проста да іх не прымацавалі завушыны і не было ўпакоўкі. Цана гатовага тавару няспынна расла, свой працэнт бралі і камерцыйныя структуры. А ў выніку ўвесь «банкет» аплачваў канчатковы пакупнік.

Яшчэ адзін замежнік спрабаваў нелегальна прадаць праз інтэрнэт 260 абарончых рэспіратараў. Некалькі месяцаў таму ён набыў іх у адным са сталічных гандлёвых цэнтраў. На момант рэалізацыі цана аднаго такога рэспіратара падскочыла ў некалькі разоў, да 12 рублёў. Натуральна, прадавалася ўсё гэта праз інтэрнэт без якіх-небудзь дакументаў — што і стала падставай да прыцягнення 43-гадовага мужчыны да адказнасці за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

У поле зроку аператыўнікаў трапіла і 33-гадовая жыхарка Віцебска, якая вырашыла зарабіць на перапродажы праз інтэрнэт медыцынскіх пальчатак. Яна набыла іх на адной з гандлёвых пляцовак, дзе пасля і прадавала. Агульны кошт канфіскаваных тавараў пацягнуў больш чым на 400 рублёў.

Цяпер па выяўленых фактах праводзіцца праверка, вырашаецца пытанне аб тым, каб прыцягнуць парушальнікаў да адміністрацыйнай адказнасці за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

— Агулам у Беларусі выяўлена ўжо каля двух дзясяткаў фактаў незаконнай рэалізацыі сродкаў індывідуальнай абароны, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік МУС Вольга ЧАМАДАНАВА.** — Складзена стольскі ж адміністрацыйных пратаколаў за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць і парушэнне правіл гандлю і аказання паслуг насельніцтву. Аператыўнікі канфіскавалі з незаконнага абарачэння даволі вялікую колькасць сродкаў індывідуальнай абароны — больш за 250 тысяч медыцынскіх масак, 6 тысяч пар пальчатак і 80 літраў дэзынфіцыруючага сродку. Агульны кошт тавараў перавысіў 180 тысяч рублёў.

## ЗАПАЛОХАЦЬ І ПАКІНУЦЬ БЕЗ ГРОШАЙ

Натуральная чалавечая рэакцыя на небяспеку, якую ўяўляе сабой каранавірус, — страх. Стапрацэнтнай абароны ад гэтага нябачнага ворага пакуль не існуе. Затое актывізаваліся махляры, якія карыстаюцца сітуацыяй і мяркуюць на ёй узбагаціцца.

— Такія зламыснікі — дасведчаныя псіхолагі, якія ўпэўнена выкарыстоўваюць прыёмы перакanання, — заўважае Вольга Чамаданава. — Дзякуючы гэтаму яны вельмі лёгка ўваходзяць у кантакт з ахвярай і выклікаюць да сябе прыязнае стаўленне. Робяць яны стаўку і на асаблівасці ўзросту, з-за якіх пажылыя людзі не заўжды могуць дэталёва запомніць іх знешнасць і пасля апісаць яе.

Галоўная задача такога чалавека — трапіць у вашу кватэру і чым-небудзь там пажывіцца. А для гэтага ён можа прыкінуцца кім заўгодна. Напрыклад, як адрозніць сапраўднага медыцынскага работніка ад фальшывага? Цэлы злачынны «спектакль» быў разыграны ў Баранавічах. Дзве жанчыны прыйшлі дадому да мясцовай жыхаркі, каб прапанаваць запіс на бясплатную вакцынацыю. Падабенства з медыкамі дадавалі маскі, якія жанчыны надзелі на свае твары. Падчас афармлення «заяўкі» адна з ілжэмедыкаў непрыкметна адлучылася, як пасля высветлілася — у суседні пакой. Калі ж візіцёркі сышлі, то старая выявіла, што знікла буйная сума грошай.

— Таму ні ў якім разе не адчыняйце дзверы незнаёмцам, — раіць Вольга Чамаданава. — Будзьце пільныя і вельмі асцярожныя, калі гутарку з вамі заводзіць незнаёмы чалавек. Зносіны з ім у межах уласнага жылля трэба выключыць. Па магчымасці патэлефануйце родным або суседзям. Калі гэтага зрабіць не атрымліваецца, то трэба папрасіць візіцёра прыйсці пазней. І пазначце на відным месцы спіс тэлефонных нумароў камунальных, сацыяльных і аварыйных службаў, а таксама рэгістратуры паліклінікі і свайго ўчастковага інспектара. Яны вам спатрэбяцца для праверкі наведвальніка — ці сапраўды ён той, кім прадстаўляецца.

Пад прыцэлам злачынцаў не толькі наяўныя грошы, але і тыя, што ляжаць на банкаўскім рахунку, а таксама персанальныя звесткі.

— Нам вядома пра выпадак імітацыі афіцыйнай рассылкі СМС-паведамленняў на мабільныя тэлефоны, — адзначыла **афіцыйны прадстаўнік ГУУС Мінгарвыканкама Наталля ГАНУСЕВІЧ.** — У ёй паведамлялася пра аднабаковае рашэнне банка пералічыць працэнты па дэпазіце ў Фонд барацьбы з каранавірусам згодна з пастановай Савета Міністраў. Але ўся соль у тым, што такой пастановы не існуе ў прыродзе. Да гэтага паведамлення была прымацавана спасылка. Калі на яе націснуць, то там запытваюцца асабістыя звесткі. Як толькі вы іх паведамляеце — тым самым даеце махляру ключ да ўсіх сродкаў, якія на гэтай картцы ляжаць.

Толькі гэтым спосабам ашуканцы не абмяжоўваюцца. Напрыклад, у свеце сёння распаўсюджана рассылка лістоў нібыта ад імя Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Мэта адпраўшчыкаў ідэнтычная — пры дапамозе сацыяльнай інжынерыі выцягнуць з вас усе неабходныя паролі і іншыя персанальныя звесткі. Пры гэтым яны могуць маскіравацца цалкам, на першы погляд, дабрачыннымі матывамі — напрыклад, зборам ахвяраванняў на барацьбу з вірусам. Таму міліцыянеры раяць такія паведамленні проста ігнараваць, а тым больш не пераходзіць ні на якія спасылкі і не паведамляць паролі, звесткі з карткі і яе CVV-код.

# Сціпласць — якасць героя

**Здарэнне адбылося ў Слуцкім раёне 19 красавіка. У міліцыю паступіў выклік пра тое, што ў аграгарадку Гацук адзін з кіроўцаў парушыў правілы паркоўкі аўтамабіля. На месца падзей адправіўся маёр міліцыі Дзмітрый Семібратаў.**

Непадалёк ад паркоўкі, каля пад'езда жылога дома, міліцыянер заўважыў натоўп людзей. Некалькі чалавек штосьці ажыўлена абмяркоўвалі, астатнія проста ціха стаялі. Гэта прыцягнула ўвагу афіцэра. Ён папрасіў аўтаўладальнікаў, якія працягвалі спрачацца наконт таго, ці былі парушаны правілы дарожнага руху, заставацца на месцы, а сам адправіўся да жылога дома. І ўбачыў, што на зямлі ляжыць дзяўчынка, якая не падае прыкмет жыцця. Людзі з натоўпу растлумачылі, што яна чымсьці падавілася і не можа дыхаць. Міліцыянер заўважыў, што ў малой пачалі сінець твар і рукі. На роздумы часу не заставалася, трэба было дзейнічаць.

Дзмітрый Семібратаў падняў небараку на рукі і рэзка націснуў рукой у вобласць сонечнага спляцення. З рота дзяўчынкі тут жа вывалілася пласціна, якая служыла для выпраўлення прыкусу. А разам з ёй — кавалак булкі, які і перакрыў дыхальныя шляхі. Малая пачала дыхаць, яе твар зноў стаў ружовы. Упэўніўшыся, што яна ў бяспецы, супрацоўнік ДАІ вярнуўся на стаянку, каб закончыць справу, дзеля якой яго выклікалі ў аграгарадок.

Маёр міліцыі нікому не расказаў пра свой учынак. Пра яго стала вядома тады, калі маці дзяўчынкі звярнулася з падзякай ва УУС Мінаблвыканкама.

# Міліцыя — урачам

**Аднайменная дабрачынная акцыя праводзіцца з 15 красавіка па ініцыятыве супрацоўнікаў міліцыі і афіцэрскіх сходаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў. Да яе далучыліся ўсе падраздзяленні. За сабраныя грошы набываюцца сродкі індывідуальнай абароны, якія затым перадаюцца ва ўстановы аховы здароўя.**

Напрыклад, сталічныя міліцыянеры ўжо перадалі ў бальніцу хуткай дапамогі тысячу ахоўных касцюмаў. Абаронча камбінезоны паступілі і ў Глушанскую ўчастковую бальніцу, якая знаходзіцца ў Бабруйскім раёне. Галоўны ўрач Клімавіцкай цэнтральнай раённай бальніцы Людміла Захаранка атрымала ад раённага аддзела ўнутраных спраў грашовы сертыфікат на набыццё ўсіх неабходных тавараў. Супрацоўнікі Лоеўскага РАУС набылі для мясцовай бальніцы 150 пар ахоўных пальчатак. Калектыў Ушацкага РАУС перадаў медыкам маскі, пальчаткі, антысептыкі і дэзынфіцыруючыя сродкі. І гэта толькі некалькі прыкладаў таго, як міліцыянеры дапамагаюць медыкам.

Масавы пашыў ахоўных масак і камбінезонаў распачаўся на ўсіх прадпрыемствах крымінальна-выканаўчай сістэмы, якія маюць швейныя ўчасткі і цэхі.

— Намі былі задзейнічаны ўсе рэсурсы, а таксама набыта дадатковае абсталяванне, — адзначыў **начальнік аддзела ўпраўлення арганізацыі вытворчасці і працоўнага выкарыстання спецкантынгенту Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь Данііл ЯЦКОЎ.** — Праводзяцца ўсе неабходныя санітарныя мерапрыемствы. Нашы магутнасці дазваляюць цалкам забяспечыць патрэбы органаў і падраздзяленняў унутраных спраў, у тым ліку і самой крымінальна-выканаўчай сістэмы. Шмат сродкаў індывідуальнай абароны адгружаецца і ў адрас Міністэрства аховы здароўя.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

3 июня 2020 г. № 1-Н/2020

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права заключения договора аренды земельного участка в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение | Кадастровый номер и площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-865 по генплану) по ул. Монтажной, 10 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 340100000008003437 0,0810 га | 7 252,71 | 200,00 | 3 377,62 | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, обременения: фундамент в виде железобетонных свай |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

1.1 **Начальная цена** предмета аукциона сформирована как сумма начальной цены не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома согласно заключению об оценке РУП «Гомельское агенство по государственной регистрации и земельному кадастру» в размере **4 408,46** бел. руб. и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка в размере **2 786,40** бел. руб., а также расходов на оценку не завершенного строительством жилого дома в размере **57,85 бел. руб.**

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов на земельном участке в г. Гомель, предоставляемом в аренду сроком на 99 лет, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.** Получить в установленном порядке разрешительную документацию на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство одноквартирного жилого дома. Желающим предварительно ознакомиться с документами обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. №№ 3–6, №№ 3–14).

3. **Аукцион состоится 3 июня 2020 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и юридические лица, а также иностранные юридические лица, иностранные граждане. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, **на р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц.** Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

**Перечень документов, представляемых участником:**

4.1 заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; гражданам РБ – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 индивидуальные предприниматели – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок) за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть оплаты предмета аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2 После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка.

6.3 Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 29 апреля по 1 июня 2020 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

**Контактный телефон +375 232 30-12-46. Информация размещена на сайте: www.gomeloblzem.by либо geodezcentr.by**

---

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества
# ОАО «Забашевичи»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1) Капитальное строение с инв. № 610/С-55147, 1975 г.п., общая площадь по тех. паспорту – 1026,1 кв. м, целевое назначение – здание специализированное коммунального хозяйства | Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, аг. Лошница, ул. Мичурина, д. 2 | 240 000,00 | 24 000,00 | 12 000,00 |

Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 620884505101000716, площадь – 0,0534 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания дома (общежитие, гостиница)

В отношении лота проводятся первые торги.

**Окончание приема заявлений – в 16.00 19.05.2020**

Обременения в отношении реализуемого лота: аренда, ипотека ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк»

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона, либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию, в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 20.05.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by/info/.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «Задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Забашевичи» (Лот №__), проводимом 20.05.2020 г.»

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

По вопросу ознакомления с предметом торгов обращаться по тел. +375 29 862 80 48 (Лекарев Василий Иванович).

Дополнительная информация по предмету торгов по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»;

Указа Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)», Указа Президента Республики Беларусь от 04.07.2016 № 253 «О мерах по финансовому оздоровлению сельскохозяйственных организаций».

**Государственная регистрация договора купли-продажи осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, Республика Беларусь, г. Минск, улица Мележа, д. 1, офис 1121, ☎ 8 (017) 392 70 10 ☎ +375 29 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Забашевичи», 222117, Минская обл., Борисовский р-он, Гливинский с/с, а. г. Забашевичи, тел. +375 17 772 71 12 в лице управляющего – ООО «ПрофДМ», 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-27, ☎ +375 17 395 89 17** |

---

# РУП «Торговый дом «Восточный»
## извещает о проведении 14.05.2020 повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-66172, общей площадью 19,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Симонова, Гаражно-эксплуатационный кооператив «Симонова» блок № 16 гараж № 41. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: здание гаража. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000005003897, площадью 18,0964 га. **Начальная цена продажи – 1 449,00 бел. рубля, размер задатка – 144,90 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-73344, общей площадью 20,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ПГК «Чисть-2007», 35. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: индивидуальный капитальный гараж. **Начальная цена продажи – 1 323,00 бел. рубля, размер задатка – 132,30 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-30393, общей площадью 47,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Молчанова, д. 18. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: одноквартирный жилой дом. Составные части и принадлежности: кирпичный и дощатый сараи, остекленная рассадница. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 144500000015000355, площадью 0,0674 га. **Начальная цена продажи – 24 624,00 бел. рубля, размер задатка – 2 462,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Индивидуальный капитальный гараж, инвентарный номер 130/С- (не зарегистрирован в ЕГРНИ), общей площадью 20,7 кв. м, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Интернациональная, 12/265. Наименование гаражного кооператива: ГПК № 8 г. Пинска. Расположен на земельном участке с кадастровым номером 144500000014000024. **Начальная цена продажи – 2 332,80 бел. рубля, размер задатка – 233,28 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Индивидуальный капитальный гараж, инвентарный номер 130/С-(не зарегистрирован в ЕГРНИ), общей площадью 25,3 кв. м, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Интернациональная, 12/286. Наименование гаражного кооператива: ГПК № 8 г. Пинска. Расположен на земельном участке с кадастровым номером 144500000014000024. **Начальная цена продажи – 2 073,60 бел. рубля, размер задатка – 207,36 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 122/С-14367, общей площадью 60,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, Стайковский с/с, д. Нехачево, ул. Брестская, 6. Назначение: здание из блоков, облицованных кирпичом, одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом № 6. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 123488002601000132, площадью 0,2500 га. **Начальная цена продажи – 6 480,00 бел. рубля, размер задатка – 648,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-9197, общей площадью 46,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл, Кличевский р-н, Долговский с/с, д. Долгое, ул. Заречная, д. 60. Назначение: здание одноквартирного жилого дома, наименование: жилой дом. Составные части и принадлежности: одноэтажный бревенчатый жилой дом с холодной пристройкой, двумя сараями. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 723081603101000164, площадью 0,0514 га. **Начальная цена продажи – 3 628,80 бел. рубля, размер задатка – 362,88 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Земельный участок с кадастровым номером 424385700001000060, с учетом имущественных прав на него, площадью 0,1134 га, расположенный по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Волковичский с/с, СТ «Берёзка», д. 11. **Начальная цена продажи – 1 270,08 бел. рубля, размер задатка – 127,01 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-46052, общей площадью 64,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Социалистическая, д. 26, корп. 1. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: здание специализированное автомобильного транспорта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000002004401, площадью 1,0869 га. **Начальная цена продажи – 45 878,40 бел. рубля, размер задатка – 4 587,84 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-64083, площадью 472,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 34. Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-производственное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001025401, площадью 0,6700 га. **Начальная цена продажи – 103 032,00 бел. рубля, размер задатка – 10 303,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-64089, площадью 386,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Героев обороны Брестской крепости, д. 34/4. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: котельная и блок цехов. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001025401, площадью 0,6700 га. **Начальная цена продажи – 97 200,00 бел. рубля, размер задатка – 9 720,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Земельный участок с кадастровым номером 621381712601000019, площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Долгиновский с/с, д. Микулино. Целевое назначение: для строительства и обслуживания жилого дома. **Начальная цена продажи – 1 062,00 бел. рубля, размер задатка – 106,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 243/С-9982, общей площадью 41,4 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, г. Толочин, ул. Мелиораторов, 1А/2. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: столярный цех. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 224650100001000661, площадью 0,9521 га. **Начальная цена продажи – 2 754,00 бел. рубля, размер задатка – 275,40 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 140/С-30852, общей площадью 131,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 172А. Назначение: здание специализированное коммунального хозяйства, наименование: здание котельной. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 124350100002004569, площадью 0,2383 га. **Начальная цена продажи – 10 125,00 бел. рубля, размер задатка – 1 012,50 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Капитальное строение с инвентарным номером 644/С-38902, общей площадью 56,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, СТ «Дружба-Овины», 41. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый, дачный домик (дача). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625000000033000017, площадью 0,0475 га. **Начальная цена продажи – 13 154,40 бел. рубля, размер задатка – 1 315,44 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 16.** Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-28379, общей площадью 13 839,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, 25. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: отделочно-сборочный корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000008006674, площадью 1,8950 га. Обременения: аренда, ипотека. **Начальная цена продажи – 13 255 632,00 бел. руб, размер задатка – 1 325 563,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 14.05.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 11.05.2020 в 15.00.**

*Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002, г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **14 мая** 2020 года.*

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63.**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении третьих повторных открытых торгов в форме аукциона ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «Комплайнинвест»

(УНП 192936454, г. Минск, пр-т Партизанский, д. 23А, пом. 1Н, комната 1),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 15 мая 2020 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 29 апреля 2020 года по 13 мая 2020 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, просп. Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Комплайнинвест» (УНП 192936454)** в лице управляющего Частного унитарного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. 8 (033) 653-38-17.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, руб. | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 100/D-102846 (назначение – торговое помещение с долей вспомогательных помещений, наименование – магазин) 1973 года постройки, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Кривошеина, 9-97, площадь – 1595,2 кв. м. Сведения о земельном участке: кадастровый номер участка – 140100000001005257 (доля 731/2500 в праве постоянного пользования, доля 3457/5000 в праве постоянного пользования КУП «Жилищное ремонтно-эксплуатационное управление г. Бреста», доля 81/5000 в праве постоянного пользования ООО «БелРиэлтКомпани»), площадь земельного участка – 0,3694 га, назначение – обслуживание жилого дома со встроенным магазином | 679 963,20 руб. без учета НДС (в соответствии с подп. 2.30.2 п. 2 ст. 115 НК РБ) | 5 % | 5 % |

Для участия в торгах необходимо:

**1. В срок до 17.00 13 мая 2020 года перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».**

2. **Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 17.00 13.05.2020 заявление на участие в торгах** с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;

- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от цены продажи предмета торгов в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 215 (29082) за 13.11.2019.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 18 (29132) за 29.01.2020.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 47 (29161) за 10.03.2020.




# РЫХТУЕМСЯ ДА ЦЯЖАРНАСЦІ



## Што трэба рабіць абавязкова, а што — звычайныя забабоны

**Падрыхтоўка да цяжарнасці мусіць пачынацца як мінімум за тры месяцы. Але паводле статыстыкі каля 40 % цяжарнасцей ў не запланаваны: жанчыны звяртаюцца да гінеколага праз некалькі тыдняў пасля зачацця. Якія гэта тоіць небяспекі, якіх рэкамендацый прытрымлівацца будучых бацькоў, якія міфы існуюць пра цяжарнасць, расказала ўрач — акушэр-гінеколаг сеткі цэнтраў медыцынскіх і касметалагічных паслуг Verba Наталля ЯХНАВЕЦ.**

***— Раскажыце, навошта планаваць цяжарнасць.***

— Сёння тэрмін, на якім жанчына звяртаецца да акушэра-гінеколага, часта складае 7–8 тыдняў, часам і больш. Да гэтага моманту адбылася закладка многіх органаў і сістэм будучага малога, скончылася фарміраванне нервовай трубкі плода. І парокі развіцця, якіх можна было пазбегнуць дзякуючы прыёму той жа фоліевай кіслаты, мы ўжо не паспяваем скарэкціраваць. Часам здараецца самаадвольны выкідыш ці закладваецца цяжарнасць, якая не развіваецца, чаго таксама можна было б пазбегнуць. Часта, не здагадваючыся пра сваё цікавае становішча, пацыентка паспявае пагуляць на дні нараджэння, дзе ўжывае спіртныя напоі, прайсці рэнтгеналагічнае даследаванне, схадзіць на дэпіляцыю зоны бікіні, і потым прыходзіць да гінеколага з пытаннем: «Што мне за гэта будзе?» Як правіла, гэта не цягне сур'ёзных ускладненняў, але дастаўляе шмат перажыванняў і стрэсу. Ідуць тыдні і месяцы, пакуль пацыентка не пройдзе ў 12 тыдняў скрынінгавае УГД і не пачуе, што ўсё добра.

На жаль, бываюць і больш сумныя гісторыі, калі пацыентка, якая лечыць малочніцу гадамі, не здагадваючыся пра цяжарнасць, пры сімптомах ідзе ў аптэку, набывае флуканазол, які заўсёды дапамагаў. А гэты прэпарат валодае эмбрыятаксічным тэратагенным дзеяннем, і такую цяжарнасць даводзіцца перарываць. Здараецца, пры цяжарнасцях малога тэрміну ў пацыентак павышаецца тэмпература цела да 37,2—37,3 градуса, і ў гэты няпросты час яны звязваюць свой стан з віруснай інфекцыяй і набываюць у аптэцы антыбіётыкі, супрацьвірусныя прэпараты. Выкарыстанне такіх сродкаў на ранніх тэрмінах тоіць небяспеку замерлай цяжарнасці, фарміравання парокаў развіцця і выкідышаў.

***— Што ўключае падрыхтоўка да цяжарнасці?***

— Гэта комплекс лячэбна-прафілактычных і дыягнастычных мерапрыемстваў, якія дапамагаюць пары падысці да надыходу цяжарнасці ў найлепшым псіхічным і фізічным здароўі. Яна прадугледжвае карэкціроўку спосабу жыцця, ужыванне некаторых вітамінаў, а таксама комплекс абследаванняў.

***— Які аптымальны ўзрост будучых бацькоў?***

— З пункту погляду медыцыны — з 19 да 35 гадоў. Як у больш юным, так і ў старэйшым узросце павялічваецца імавернасць прыроджаных парокаў развіцця, колькасць ускладненняў цяжарнасці, родаў і пасляродавага перыяду. Сёння модна планаваць цяжарнасць у больш познім узросце. Калі ў 2000-х сярэдні ўзрост першай цяжарнасці быў 20-21 год, то ў 2017—2018-м ён складаў 30-31 год.

Чым старэйшая жанчына, тым большая імавернасць узнікнення ў яе тэрапеўтычных захворванняў, расце частата гінекалагічных хвароб, такіх як міёмы, эндаметрыёз, бясплоддзе, паталогіі шыйкі маткі, старэе генетычны матэрыял яйцаклеткі, змяншаецца фалікулярны запас. Важным з'яўляецца той факт, што пасля 35 гадоў запас яйцаклетак прагрэсіўна зніжаецца. Часам для ўзроставых жанчын адзінай магчымасцю мець дзяцей з'яўляецца выкарыстанне рэпрадуктыўных тэхналогій з прыцягненнем сурагатнай маці ці выкарыстанне донарскіх яйцаклетак.

***— Гэта значыць, што пасля 40 нараджаць небяспечна?***

— Нараджаць можна, але варта планаваць цяжарнасць. У старэйшым узросце яна патрабуе больш старанай падрыхтоўкі і назірання. Здараецца, што цяжарнасць надыходзіць у 42-43 гады. Такую жанчыну мы больш старанна абследуем, у тым ліку накіроўваем да генетыка, але не перарываем цяжарнасць.

***— Які перапынак паміж першай і другой цяжарнасцю лічыцца аптымальным?***

— Інтэрвал паміж цяжарнасцямі складае 24 месяцы. Гэта той мінімальны час, які неабходны для аднаўлення арганізма жанчыны, яе гарманальнага фону, запасу неабходных вітамінаў і мікраэлементаў. Асабліва гэта важна для тых, у каго было кесарава сячэнне.

Канешне, падчас практыкі даводзілася назіраць пацыентак, якія прыходзілі з меншым інтэрвалам. Зразумела, мы не перарываем такую цяжарнасць, а робім усё магчымае, каб знізіць колькасць ускладненняў. Але трэба сказаць, што гэта з'яўляецца каласальным стрэсам не толькі для пацыенткі, але і для ўсёй сям'і. Значна часцей узнікае пагроза перарывання цяжарнасці, якая патрабуе шпіталізацыі ў стацыянар. Устае праблема: хто будзе глядзець малога? І часта таты аказваюцца да гэтага не гатовы.

Калі быў самаадвольны выкідыш, замерлая цяжарнасць ці яна была перарвана па жаданні пацыенткі, то планаваць наступную варта не раней, чым праз тры-шэсць месяцаў.

***— Вы сказалі, што пры падрыхтоўцы да бацькоўства варта змяніць спосаб жыцця...***

— Гэта адзін з ключавых момантаў. Здавалася б, банальная парада — пазбавіцца шкодных звычак, але яна датычыцца не толькі жанчын. Многія мужчыны не адносяць ужыванне піва да шкодных звычак. Тым часам яно ўтрымлівае эстрагенападобныя рэчывы, якія могуць пагоршыць якасць спермы. Забарона фізічных нагрузак для цяжарных — вялікі міф. Наадварот: умераныя фізічныя нагрузкі дазваляюць жанчыне падысці да родаў у лепшай фізічнай форме. Таксама неабходная нармалізацыя рэжыму сну, што дазваляе арганізму правільна выпрацоўваць гармоны — цяжарнасць настае хутчэй і праходзіць з меншай колькасцю ўскладненняў. Важным з'яўляецца збалансаванае харчаванне. Вучоныя спрачаюцца сёння наконт карысці вялікай колькасці штучных вітамінаў. Абавязковае ўжыванне полівітамінаў — гэта яшчэ адзін міф. Варта пастарацца нармалізаваць харчаванне і ліквідаваць дэфіцыт мікраэлементаў за кошт правільнага збалансаванага рацыёну. Трэба мінімізаваць стрэс і наладзіць рэгулярны рытм палавога жыцця — два-тры разы на тыдзень.

***— Якія абследаванні павінна прайсці пара пры планаванні цяжарнасці?***

— Гэты аб'ём індывідуальны, ён не павінен уключаць лішніх прызначэнняў. Калі перад намі маладая здаровая пацыентка, мы выконваем УГД органаў малога таза, па паказаннях — малочных залоз, мазок на анкацыталогію, праводзім абследаванне на інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Абавязкова рэкамендуем пацыенткам наведаць стаматолага, бо дрэнныя зубы — крыніца інфекцыі ў арганізме, а лячэнне зубоў падчас цяжарнасці выклікае вялікія праблемы як у самой пацыенткі, так і ў стаматолага. Гэта звязана як з таксікозам, так і з немагчымасцю выкарыстання абязбольваючых сродкаў.

30 % жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту маюць анемію. Таму важна зрабіць агульны і біяхімічны аналіз крыві. І скарэктаваць выяўленыя парушэнні да надыходу цяжарнасці. На сёння ёсць звесткі, што цяжарнасць пры анеміі працякае з большай частатой заўчасных родаў, з пагрозай перарывання, часцей нараджаюцца немаўляты з малой вагой, большая рызыка інфекцыйных ускладненняў падчас цяжарнасці і пасля родаў. Сёння вучоныя кажуць, што дзеці тых мам, якія ўсю цяжарнасць праходзілі з анеміяй, горш навучаюцца і маюць ніжэйшыя разумовыя здольнасці.

Калі ў пацыенткі ёсць захворванні шчытападобнай залозы, цукровы дыябет, атлусценне, неабходна пры падрыхтоўцы да цяжарнасці падключаць адпаведных спецыялістаў. Важным з'яўляецца лячэнне такіх паталогій, як хваробы нырак, сардэчна-сасудзістыя захворванні, артэрыяльная гіпертэнзія. У такім выпадку пацыенткі могуць шпіталізавацца ў стацыянар і праходзіць паглыбленае комплекснае абследаванне, ім праводзяцца кансіліумы, аздараўляецца арганізм, што дазваляе прымаць меншую колькасць медыкаментаў, а цяжарнасць працякае з меншай колькасцю ўскладненняў.

**Алена КРАВЕЦ.**


## ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

### «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение ул. Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой», опубликованную в газете «Звязда» от 21.03.2020 № 56 (29170)

**Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме № 35 по генплану в Минском районе без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика**

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 21.03.2020 № 56 (29170), следующие дополнения:

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика (на дату опубликования проектной документации):**

- 1 (одна) трехкомнатная квартира общей площадью по проекту 72,58 кв. метра. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры – 3 100 (три тысячи сто) белорусских рублей при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период по графику платежей – 3 200 (три тысячи двести) белорусских рублей.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях, перечисляется дольщиком на специальный и расчетный счет застройщика в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляются начиная с первого рабочего дня, следующего за днем опубликования настоящей декларации, в порядке живой очереди по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Со дня начала заключения договора создания объекта долевого строительства прием и регистрация заявлений на заключение договора осуществляются при заключении договора. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ООО «СИ-трейдинг» вправе заключить договор с другим претендентом.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: застройщик вправе изменить цену договора (цену объекта долевого строительства) в случаях изменения прогнозных индексов цен в строительстве в нормативный срок строительства объекта строительства и дополнительный срок строительства при продлении нормативного срока строительства в установленном законодательством порядке в случае отсутствия вины застройщика, а также изменения законодательства об уплате косвенных налогов в указанные сроки, если они оказали влияние на цену договора (цену объекта долевого строительства).

В возводимом жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться предпочтение гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by.

Спорт-тайм

# БЕЛАРУСЫ БЕЗ БАРАЦЬБЫ ТРАПІЛІ НА ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя падзеі выхадных.**

**1.** ***Выканкам Беларускай федэрацыі гандбола вырашыў датэрмінова завяршыць мужчынскі чэмпіянат краіны.*** Гэта звязана з пандэміяй каранавіруса і рэкамендацыямі Еўрапейскай федэрацыі гандбола. Зыходзячы з бягучага становішча камандаў у турнірнай табліцы, чэмпіёнам Беларусі стаў Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова. «Серабро» ў мінскага СКА, «бронза» дасталася магілёўскаму клубу «Машэка».

Спіс найлепшых бамбардзіраў узначаліў Максім Нясвадзьба («Кронан»), які закінуў 167 мячоў.

Што датычыцца жаночага чэмпіянату краіны, то вырашана правесці два паядынкі паміж лідарамі — гандбалісткамі «Гомеля» і БНТУ-БелАЗ — 13 і 17 мая. Калі першую сустрэчу выйграюць гамяльчанкі, то яны стануць чэмпіёнкамі, і другая гульня праводзіцца не будзе.

Становішча камандаў пасля першага этапу жаночага чэмпіянату: «Гомель» — 45 ачкоў, БНТУ-БелАЗ — 43, «Гараднічанка» (Гродна) — 25.

Нагадаем, раней было прынята рашэнне перанесці «Фіналы чатырох» розыгрышу Кубка Беларусі сярод мужчынскіх і жаночых камандаў на пачатак сезона–2020/2021.

**2.** ***Гандбалісты мужчынскай зборнай Беларусі атрымалі права выступіць у фінальнай стадыі чэмпіянату свету 2021 года.*** Такое рашэнне прыняў выканкам Еўрапейскай федэрацыі гандбола. У сувязі з пандэміяй каранавіруса ЕГФ вырашыла адмяніць правядзенне матчаў плэй-оф да сусветнага першынства, якія былі намечаны на лета бягучага года. Каманда Юрыя Шаўцова за выхад на ЧС-2021 павінна была паспрачацца з пераможцам пары Польшча — Літва.

Акрамя беларусаў пуцёўкі ў фінальную частку планетарнага форуму атрымалі каманды Германіі, Венгрыі, Аўстрыі, Швецыі, Францыі, Чэхіі, Славеніі, Партугаліі і Ісландыі. Раней права згуляць у фінале ЧС ад Еўропы заваявалі гандбалісты Даніі, Нарвегіі, Іспаніі і Харватыі. 37-ы па ліку мужчынскі чэмпіянат свету па гандболе пройдзе на арэнах Егіпта ў студзені 2021 года з удзелам 32 камандаў.

**3.** ***Завяршыліся матчы 6-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе.*** У заключнай сустрэчы круга футбалісты «Іслачы» выйгралі ў «Віцебска» з лікам 2:0. А раней вынікі былі такія: «Смалявічы» — «Дынама» (Мінск) — 1:3, «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр» (Салігорск) — 0:2, «Славія» (Мазыр) — «Мінск» — 1:3, «Нёман» (Гродна) — «Энергетык-БДУ» (Мінск) — 3:0, «Гарадзея» — БАТЭ (Барысаў) — 0:2, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Рух» (Брэст) — 0:0, «Слуцк» — «Белшына» (Бабруйск) — 3:2.

Турнірнае становішча пасля шасці тураў: «Слуцк» — 13 ачкоў, «Іслач» — 12, «Тарпеда-БелАЗ» — 11, БАТЭ, «Віцебск» — па 10, «Дынама» (Мінск), «Мінск», «Энергетык-БДУ», «Гарадзея», — па 9, «Нёман», «Шахцёр», «Рух» — па 8, «Дынама» (Брэст), «Славія» — па 7, «Смалявічы» — 3, «Белшына» — 2.

Бамбардзірскую гонку ўзначальвае мінскі дынамавец Яўген Шыкаўка, які забіў чатыры галы.

Наступны тур пройдзе з 1 да 3 мая.

**4.** ***Спаборніцтвы ў штурханні ядра запланаваны ў Беларусі на 30 красавіка, іх анлайн-трансляцыя пачнецца ў 18.00.*** «Сённяшняя сітуацыя, выкліканая пандэміяй COVID-19, паўплывала не толькі на каляндар, але і на трэніровачны працэс у многіх краінах. У беларускіх лёгкаатлетаў ёсць магчымасць працягваць сваю падрыхтоўку, і, вядома, яны яе не ўпускаюць. 30 красавіка ў 18.00 адбудуцца першыя ў нашай краіне афіцыйныя спаборніцтвы па штурханні ядра ў рэжыме анлайн», — адзначылі ў прэс-службе Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.

Спаборніцтвы будуць уяўляць сабой дзве дуэлі, у якіх возьмуць удзел вядучыя штурхальнікі ядра Беларусі ў розных узроставых катэгорыях. У кожнага з удзельнікаў ёсць права на выкананне шасці спроб, па выніках якіх будзе вызначаны пераможца ў кожнай з пар. Пройдуць спаборніцтвы ў месцах трэніровак лёгкаатлетаў — у Віцебску і Брэсце. За выступленнямі спартсменаў можна будзе назіраць на YouTube-канале БФЛА AthleticsBY.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**



# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.37 | 20.38 | 15.01 |
| Віцебск — | 5.22 | 20.32 | 15.10 |
| Магілёў — | 5.27 | 20.28 | 15.01 |
| Гомель — | 5.29 | 20.19 | 14.50 |
| Гродна — | 5.53 | 20.52 | 14.59 |
| Брэст — | 5.59 | 20.48 | 14.49 |

## Месяц

*Маладзік 23 красавіка. Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

***Пр.*** *Агапіі, Васілісы, Галіны, Ірыны, Нікі, Фядоры, Леаніда.*
***К.*** *Ангеліны, Катарыны, Маргарыты, Багуслава, Пятра, Роберта.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**29 КРАСАВІКА**

У краіне

**1920** год — нарадзіўся Васіль Еўдакімавіч Цыганкоў, удзельнік баёў на тэрыторыі Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944). У 1947-м скончыў Яраслаўскае ваенна-пяхотнае вучылішча. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 года. Камандзір аддзялення разведкі сяржант Цыганкоў вызначыўся 24 чэрвеня 1944-га. З групай разведчыкаў пад агнём праціўніка фарсіраваў Заходнюю Дзвіну ў раёне вёскі Мамойкі Бешанковіцкага раёна, захапіў рубеж і ўтрымліваў яго да падыходу падмацаванняў.



**2005** год — у Мінску адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця мемарыяльнага архітэктурна-скульптурнага знака «Беларусь партызанская».

**2015** год быў урачыста адкрыты музей «Лошыцкая сядзіба» ў беларускай сталіцы.

У свеце

**1930** год — нарадзіўся Жан Рашфор, французскі акцёр тэатра і кіно. Здымаўся ў фільмах «Капітан Фракас», «Картуш», «Высокі бландзін у чорным чаравіку» ды іншых.

**1945** год — пачаліся жорсткія баі за рэйхстаг (будынак ніжняй палаты парламента ў Германіі), захоп якога быў ускладзены на 79-ы стралковы корпус 3-й Ударнай арміі 1-га Беларускага фронту. Часцям корпуса былі ўручаны сцягі, зацверджаныя Ваенным саветам арміі для ўзняцця над рэйхстагам.

У гэты ж дзень савецкія войскі вызвалілі вязняў канцлагера Дахау.

**1955** год — нарадзілася Ларыса Іванаўна Удавічэнка, расійская актрыса, народная артыстка Расіі (1998). Знялася ў фільмах «Дочкі-маці», «Месца сустрэчы змяніць нельга», «На каго Бог пашле», «Зімовая вішня» і іншых.



**1970** год — нарадзілася Ума Турман, амерыканская актрыса. Здымалася ў фільмах «Крымінальнае чтыво», «Забіць Біла», «Німфаманка» ды іншых.

Так гаварыў...

**ГАРАЦЫЙ:**

*«Калі не бегаеш здаровым, давядзецца пабегаць захварэўшы».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Афіцыянт, усім шампанскага за мой кошт!**
**— Але вы тут адзін!**
**— Я ведаю.**

— Якаў Сцяпанавіч, дазвольце мне сысці раней. Жонка хоча з'ездзіць у гандлёвы цэнтр па пакупкі.
— Сядзі і працуй!
— Дзякуй, Якаў Сцяпанавіч!

**— Мама, я іду дабравольцам на вайну!**
**— Фіма, толькі недалёка, каб я цябе бачыла!**

— Мужчыны, ведайце! Семкі — гэта не толькі адзін–два кілаграмы шалупіння, але і тры–чатыры гадзіны жаночага маўчання!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1293.
Нумар падпісаны ў 19.30 28 красавіка 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12